специалистами в области предупреждения и ликвидации чрезвычайных ситуаций и ликвидации их последствий.

Отмечена и необходимость расширения международного сотрудничества в области образования, науки, здравоохранения, информатизации, культуры, спорта и туризма, а также развития сотрудничества с международными организациями и межгосударственными образованиями в области кодификации и прогрессивного развития международного права.

В разделе, посвященном трансграничному сотрудничеству, говорится о содействии созданию еврорегионов как перспективной формы приграничного взаимодействия, взаимодействии с зарубежными партнерами в целях развития приграничной и транспортной инфраструктуры путем совместной разработки и реализация региональных проектов технического содействия [1].

По мнению отечественного специалиста-международника В. Е. Улаховича, специфическое структурирование данного документа, в частности отказ от его деления на статьи, как того требует нормотворческая техника, обязательная для других законов страны, позволяет достаточно гибко и адекватно реагировать на текущую ситуацию в мире и внешнеполитическое поведение крупных геополитических игроков. Поэтому значение закона с течением времени не утратит своей актуальности, наоборот, с годами оно будет лишь возрастать [2, с. 276]. В целом с этим утверждением можно согласиться, хотя в оперативном плане, на пятилетку, стране возможно и не хватает Концепции внешней политики, в которой были бы прописаны цели и задачи на текущий момент и краткосрочную перспективу с учетом имеющихся у белорусского государства возможностей, а также вызовов и угроз современного мира. Хотя программно-конституционная форма дает основания многим считать именно его внешнеполитической концепцией страны [2, с. 281].

Таким образом, Закон «Об утверждении основных направлений внутренней и внешней политики Республики Беларусь» от 14 ноября 2005 г. является концептуальным для внешнеполитической сферы страны и, наряду с Конституцией Республики Беларусь, вот уже на протяжении почти полутора десятка лет определяет внешнеполитическую линию поведения белорусского государства на мировой арене.


1. Об утверждении Основных направлений внутренней и внешней политики Республики Беларусь [Электронный ресурс] : Закон Респ. Беларусь от 14 нояб. 2005 г. № 60-З : с изм. и доп. от 4 июня 2015 г. № 275-З // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. – Режим доступа: http://www.pravo.by/document/?guid=3871&p0 =H10500060. – Дата доступа: 10.01.2019.
2. Улахович, В. Е. Формирование основ внешней политики Республики Беларусь (1991–2005 гг.) / В. Е. Улахович. – Минск : Харвест, 2009. – 352 с.


**Півавар М.В.**

## КРЫНІЦЫ ДА СТВАРЭННЯ “ЗВОДУ ПОМНІКАЎ, ПАМЯТНЫХ МЕСЦАЎ І ПАХАВАННЯЎ ЧАСОЎ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ”

Святкаванне 75-годдзя вызвалення Беларусі да нямецка-фашысцкіх захопнікаў зноў прыцягвае ўвагу грамадства да ўрокаў вайны, кошту перамогі, увекавечання яе падзей, стану помнікаў, прысвечаных ёй.

Неверагодна, аднак значная колькасць помнікаў прысвечаных вайне не знаходзіцца зараз пад аховай дзяржавы. Так сталася, што Указ Прэзідэнта № 109 “Об увековечении памяти о погибших при защите Отечества и сохранении памяти о жертвах войн”[20] ахоўвае толькі пахаванні. У Дзяржаўны спіс Гісторыка-культурных каштоўнасцяў Беларусі ўключаны не больш адной трэці помнікаў прысвечаных вайне. У выніку недасканаласці заканадаўства з-пад аховы выпалі цэлыя катэгорыі помнікаў і месцаў мемарыялізацыі падзей вайны.

Што рабіць? Можна зрабіць прапановы па ўнясенні дапаўненняў ва Указ Прэзідэнта № 109 аб ўключэнні ў спіс ахоўных аб’ектаў такіх катэгорый як “месца спаленай вёскі”, “месцы загубы савецкіх грамадзян”, “памятныя месцы”. Ці распрацаваць асобны Закон, як гэта прадугледжвалася ў 1992 г.[15], у адпаведнасці з якім пад ахову будуць узяты акрамя пахаванняў (воінскіх і ахвяр вайны) помнікі, архітэктурныя збудаванні і інш. аб’екты якія ўвекавечваюць памяць пра вайну. Магчыма ў будучым прадугледзіць стварэнне Інстытута нацыянальнай памяці. Можна ўключыць усе помнікі вайны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных



Репозиторий ВГУ

каштоўнасцяў. Але гэта запатрабуе істтотных дадатковых фінансавых выдаткаў, павялічыць Спіс на некалькі тысяч аб'ектаў, большасць з якіх тыповыя, не маюць высокай мастацкай вартасці.

На нашу думку, больш верным будзе рашэнне аб падхыхтоўцы "Звода помнікаў, памятных месцаў і пахаванняў Вялікай Айчыннай вайны". Па яго стварэнні трэба прыняццьусе занесеныя ў яго аб'екты пад ахову мясцовых распарадчых органаў. 16.11. 2018 г. Віцебскі райвыканкам прыняў рашэнне аб стварэнні такога "Зборупомнікаў, памятных месцаў і пахаванняў Вялікай Айчыннай вайны Віцебскага раёна". На X сесіі Віцебскага абласнога савета дэпутатаў было прынята рашэнне аб стварэнні такіх Збораў у кожным раёне і зводнага збора Віцебскай вобласці.

Для падрыхтоўкі такога выдання трэба правесці грунтоўную інвентарызацыю існуючых, выяўленне невядомых пахаванняў, помнікаў і памятных месцаў. У першую чаргу трэба звярнуць увагу на ўжо вядомы комплекс крыніц і літаратуры па гэтаму пытанню. Пачнем аднак, не з крыніц, а з літаратуры, таму, што для членаў камісій прасцей будзе спачатку выявіць комплекс інфармацыі ў друкаваных крыніцах, а потым па памгчымасці звярнуцца ў архівы.

*Бібліяграфія*. У першую чаргу ў выяўленні месцаў памяці пра падзеі вайны трэба прааналізаваць "Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі" [8] і "Дзяржаўны спіс гісторыка-культуных каштоўнасцяў Беларусі" [7] і "Зводны спіс воінскіх пахаванняў і пахаванняў ахвяр вайны"[16], які вядзецца Упраўленнем па ўвекавечанні Міністэрства абароны Беларусі. Варта паглядзець і "Каталог воинских захоронений на территории Республики Беларусь" [9], але ён, як і зборнік дакументаў "Увековечение памяти защитников Отечества и жертв войн в Беларуси, 1941–2008 гг." [19] выдадзены вельмі малым тыражом і ў Віцебску адсутнічае.

Важнай крыніцай у правядзенні інвентарызацыі і выяўленні невядомых месцаў памяці з'яўляюцца гісторыка-культурныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі "Памяць" [13]. Некаторую інфармацыю пра месцы, звязаныя з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны ў Віцебскім раёне можна знайсці ў вучэбна-хрэстаматыйных выданнях, падрыхтаваных у некаторых раёнах накшталт "Чашнiказнаўства", "Паставазнаўства", "Полацказнаўства" і інш. спашлемся на такое выданне, прысвечанае Віцебскаму раёну– "Віцебскі раён: краязнаўчыя нарысы" [3], а таксама зборніках канферэнцый.

Асобнай увагі варты выданні і матэрыялы вядомых дзеячаў пошукавага руху Беларусі, у тым ліку Л.Н. Бруевай [1], А. Бурдо[2], Я. Трапезнікавай[18].

Пэўную інфармацыю пра месцы, якія варта ўзяць пад ахову можна выявіць у выданнях мясцовых краязнаўцаў. Для Віцебскага раёна гэта кнігі А. Ганчарова [6], Д. Газіна [4,5].

Каштоўную інфармацыю пра памятныя месцы і важныя эпізоды ў Вялікай Айчыннай вайне на тэрыторыі раёна можна выявіць у артыкулах краязнаўцаў, якія змешчаны ў мясцовым перыядычным друку. Калі казаць пра Віцебскі раён, гэта артыкулы ў "Жыцці Прыдзвіння", а раней у "Ленінскай праўдзе" Д.Р. Газіна, В.Ц. Кухаравай, Б.Я. Леганькова, У.І. Мезенцава, Л.К. Нікіцінай, В.Д. Цярэшчанка, М.Д. Юшкевіч. Некаторыя звесткі можна знайсці ў рукапісных ўспамінах Д.Р. Газіна, М.Х. Плавінскага. Па шэрагу прычын значная частка матэрыялаў найлепшых знаўцаў краю не друкуецца, а з сыходам з жыцця іх носбітаў яна губляецца назаўсёды. Таму вельмі важна аформіць з імі інтэрвью, запісаць інфармацыю, па магчымасці зрабіць копіі матэрыялаў.

Пэўная інфармацыя пра месцы пахаванняў ахвяр вайны можа змяшчацца ў даведніку "Лагеря советских военнопленных в Беларуси 1941–1944" [10], "Справочник о местах принудительного содержания гражданского населения" [17].

Істотную дапамогу ў выяўленні інфармацыі пра месцы памяці, удакладненні інфармацыі можа аказаць Інтэрнэт. Вялізная колькасць патрэбнай інфармацыі змяшчаецца ў дакументах, выкладзеных у АБД "Мемарыял" [11], "Память народа" [12]. Краязнаўцам з Вымнянскай СШ Віцебскага раёна У. Марозам распрацаваны сайт "Ценою жизни", які змяшчае грунтоўную інфармацыю пра воінскія пахаванні на тэрыторыі Вымнянскага сельскага савета Віцебскага раёна [21].

*Крыніцы дакументальныя*. У першую чаргу трэба выкарыстоўваць дакументы Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці (ДАВВ). Патрэбная інфармацыя можа знаходзіцца ў фондах *віцебскага абласнога камітэта КПСС, ваеннага аддзела аблвыканкама, упраўлення культуры*.



Репозиторий ВГУ

Па-першае, трэба выявіць спісы першаснага пахавання, па-другое, у дакументах па ўвекавечанні можна выявіць помнікі, якія былі ўсталяваны, але на дадзеный момант не ўзяты пад ахову, не вядомы мясцовым уладам.

Для выяўлення месцаў пахавання ахвяр вайны варта прааналізаваць матэрыялы віцебскай абласной Надзвычайнай камісіі па зладзеяннях фашыстаў. Напрыклад, "Справка о злодеяниях на 9.01. 1944 г.". аднак, адзначым, што такія дакументы па шэрагу прычын малаінфарматыўны. Эксгумацыя парэшткаў праводзілася выбарачна, як правіла толькі ў некалькіх магілах, а падлікі і вывады рабіліся на аснове экстрапаляцыі дадзеных з аднаго пахавання на ўсе. Напрыклад, на месцы канцлагера "5 полк" у Віцебску з больш 50 пахаванняў была раскопана 3 магілы, колькасць пахаваных у іх памножылі на колькасць магіл. Такім чынам атрымалася лічба 80 тысяч. Аднак, гэта толькі прыблізна і недакладна. Другой праблемай стала то, што немцы разумеючы, што прыдзецца адказваць за масавыя забойствы праводзілі эскгумацыю цел і спальванне. Таму, у значнай колькасці пахаванняў цел няма ці зусім не шмат. Трэцяй праблемай стала тое, што на працягу вайны і адразу пасля вайны Надзвычайнымі камісіямі галоўным чынам улічваліся матэрыяльныя страты, нанесеныя фашыстамі. Гэта рабілася з мэтай скласці факталагічную базу для прад'яўлення абвінавачвання фашысцкім ваенным злачынцам на Нюрэнбергскім працэсе і абсанавання памераў рэпарацый ад Германіі. На людскія страты швагі амаль не звярталася.

Важную інфармацыюможна выявіць у пастановах і рашэннях віцебскага райвыканкама.Напрыклад "О благоустройстве могил воинов Советской армии", ці ў пастанове Віцебскага Райсаветаад 1.08.1944 г. "О сохранении и уходе за местами захоронения воинов Красной армии и партизан, погибших в Великой Отечественной войне и похороненых на территории БССР". Вельмі інфармацыйынай можа быць пастанова ЦК КПБ (1966 г.), адпаведна якой быў распрацаваны і прыняты перспектыўны план ўвекавечання подзвігаў савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Па ім, напрыклад, толькі ў Віцебскім раёне планавалася ўсталяваць 127 мемарыяльных дошак! [14].

Асабліва каштоўнымі могуць быць звесткі,якія можна знайсці ў асабістых фондах краязнаўцаў. Для Віцебскага раёна, гэта Ф. 330. Д.Р. Газіна.

Напрыканцы адзначым, што праца з крыніцамі і літаратурай павінна спалучацца з палевымі даследаваннямі, выяўленнем, ўдакладненнем, верыфікацыяй дадзеных атрыманых у архівах і бібліятэках. Часам размова з мясцовымі жыхарамі можа даць больш інфармацыі, чым газетны артыкул. Лепей спалучаць гэтыя формы працы.

Такім чынам, кола крыніц для стварэння "Зводу помнікаў, памятных месцаў і пахаванняў часоў Вялікай Айчыннай вайны" досыць вялікае і яго вывучэнне, пры сталучэнні з іншымі крыніцамі інфармацыі дазволіць распрацаваць якасны прадукт.

1. Бруева, Л. Пока не похоронен последний солдат (из истории поискового движения в Витебской области): справочное издание / Л. Бруева. – Орша : Оршанская типография, 2009. – 496 с.
2. Бурдо, А. Не предай забвению! Малоизвестные страницы войны (из опыта поисковой работы) / А. Бурдо. – Витебск : Диджитал-Экспресс, 2008. – 90 с.
3. Віцебскі раён: краязнаўчыя нарысы / І. А. Абрамава [і інш.] ; аўт.-уклад. М. В. Півавар. – Мінск : Паркус плюс, 2008. – 328 с.
4. Газин, Д. Р. Лужеснянские страницы / Д. Р. Газин. – Витебск : Витебская областная библиотека, 2002. – 94 с.
5. Газин, Д. Р. Пылал Придвинский край: Рассказы о войне / Предисл. И. А. Шишковой. – Витебск : УПП "Витебская областная типография", 2005. – 144 с.
6. Гончаров, А. А. Первая Витебская партизанская бригада (1941–1943 гг.) / А. Гончаров. – Витебск : Витебская областная типография, 2012. – 321 с.
7. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь / склад. В. Я. Абламскі, І. М. Чарняўскі, Ю. А. Барысюк. – Мн. : БЕЛТА, 2009. – 684 с.
8. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць/ АН БССР; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд. кал.: С. В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн. : БелЭн, 1985. – 496 с.
9. Каталог воинских захоронений на территории Республики Беларусь. Витебская область / М-во обороны Респ. Беларусь. – Минск : Рекахус, 2013. – 370 с.
10. Лагеря советских военнопленных в Беларуси 1941–1944: Справочник / авт.-сост. В. И. Адамушко [и др.]. – Мн. : НАРБ, 2004. – С. 99–101
11. ОБД "Мемориал" [Электронны рэсурс]. – Рэжым карыстання: https://obd-memorial.ru. – Дата доступу: 15.01.2019.
12. Память народа [Электронны рэсурс]. – Рэжым карыстання: https://pamyat-naroda.ru. – Дата доступу: 15.01.2019 г.



Репозиторий ВГУ

13. Памяць: Віцебскі раён: Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / Уклад. У.І. Мезенцаў. – Мн. : Маст. літ., 2004. – 772 с.
14. Пастанова Прэзідыума ЦК КПБ 17.01.1966 г. "Аб далейшай рабоце па ўвекавечанні гераічных подзвігаў савецкіх людзей у перыяд Вялікай Айчыннай вайны"
15. Постановление Совета Министров Республики Беларусь № 763 от 21.12.1992. Об увековечении памяти защитников Отечества и жертв войн // Об увековечении памяти Защитников Отечества и жертв войн [Электронны рэсурс] // Белзакон. – Рэжым карыстання: https://belzakon.net/%D0%97D091/1994/95951. – Дата доступу: 12.11.2018.
16. Сводная учетная ведомость воинских захоронений и захоронений жертв войн на территории Республики Беларусь [Электронны рэсурс]. – Рэжым карыстання: Электронная табліца.
17. Справочник о местах принудительного содержания гражданского населения на окупированной территории Беларуси 1941–1944 / Авт.-сост. В. И. Адамушко [и др]. – Мн. : НАРБ, 2001. – 158 с.
18. Трапезникова, Е. Мы ищем на земле ровесников следы… / Е. Трапезникова. – Полоцк : Издатель А. И. Судник, 2008. – 171 с.
19. Увековечение памяти защитников Отечества и жертв войн в Беларуси, 1941–2008 гг. Документы и материалы / ред. кол. В. И. Адамушко [и др.]. – Минск : НАРБ, 2008. – 302 с.
20. Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 109 ад 24 сакавіка 2016 г. "Об увековечении памяти о погибших при защите Отечества и сохранении памяти о жертвах войн" [Электронны рэсурс] // kodeksy-by.com. – Рэжым доступа: http://kodeksy-by.com/norm_akt/source-%D0%9F% D1%80%D0% 0% /109-24.03.2016.htm. – Дата доступу: 12.11. 2018.
21. Ценою жизни [Электронны рэсурс]. – Рэжым карыстання: http://pomnim.vymno.of.by/bm-rajona.html. – Дата доступу: 19.11.2018.

Репозиторий ВГУ